жср 3228
07/237

Пралетары ўсіх краін, яднайцеся!

# Ленінскі Сцяг

Орган Лёзненскага РККП(б)Б і Райсовета дэпутатаў працоўных

№ 3 Пятніца, 29 кастрычніка 1943 г.

28 КАСТРЫЧНІКА НАШЫ ВОЙСКІ АВАЛОДАЛІ РАЁННЫМ ЦЭНТРАМ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ ГОРАДАМ СУРАЖ—ВІЦЕБСКІ, А ТАКСАМА ЗАНЯЛІ БОЛЬШ 90 ІНШЫХ НАСЯЛЕННЫХ ПУНКТАЎ

Библиотека АН БССР

## УСЕСАЮЗНАМУ ЛЕНІНСКАМУ КОМУНІСТЫЧНАМУ САЮЗУ МОЛАДЗІ

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) шле гарачае прывітанне Ленінскаму Комсамолу ў дзень яго 25-годдзя.

Свой юбілей комсамол адзначае ў абстаноўцы вялікай Айчыннай вайны супроць нямецка-фашысцкіх катаў, якія пасягнулі на свабоду і незалежнасць советскага народа, на шчасце нашай моладзі. Многамільённы комсамол, советская моладзь разам з усім народам падняліся на абарону сваёй Айчыны.

25 год комсамол пад кіраўніцтвам бальшэвіцкай партыі выхоўваў моладзь у духу ленінізма, у духу вернасці Радзіме і бязмежнага служэння свайму народу. Комсамол з'яўляецца верным памочнікам і баявым рэзервам партыі Леніна-Сталіна.

У годы мірнага соцыялістычнага будаўніцтва комсамольцы і комсамолкі—лепшыя прадстаўнікі советскага маладога пакалення праславілі сябе ўдарнай работай у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, на транспарце. Яны былі ў першых радах будаўнікоў фабрык і заводаў, калгасаў і саўгасаў, авалодвалі сучаснай навукай і культурай.

У вялікай Айчыннай вайне советская моладзь праявіла высокае сазнанне свайго абавязка перад Радзімай і несакрушальную волю да разгрому ворага. Яна з'явілася дастойнай пераемніцай гераічных традыцый нашага народа, баявых традыцый партыі бальшэвікоў. Маладыя советскія воіны—лётчыкі, танкісты, артылерысты, пехацінцы, байцы ўсіх родаў войск, юныя партызаны і партызанкі бясстрашна б'юцца з подлымі захватчыкамі. Нашы юнакі і дзяўчаты, замяняючы на вытворчасці пайшоўшых на фронт бацькоў і старэйшых братоў, напружанай працай памагаюць Чырвонай Арміі граміць ворага. Советская моладзь паспяхова авалодвае ведамі і тэхнікай вытворчасці і ваеннай справай. Комсамол горача ўзяўся за аднаўленне гаспадаркі і культурных устаноў у раёнах, вызваленых ад нямецкіх пагромшчыкаў. Маладыя патрыёты аддаюць усе свае сілы абароне і ўмацаванню соцыялістычнай бацькаўшчыны.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) выражае ўпэўненасць, што Ленінскі комсамол з часцю выканае свой абавязак перад Радзімай, будзе і надалей самаадданна змагацца за поўнае вызваленне нашай зямлі ад захватчыкаў, сплоціць і павядзе за сабой советскую моладзь, выхоўваць яе ў духу патрыятызма, вернасці заветам Леніна, адданасці бальшэвіцкай партыі.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ!

СЛАВА НАШАЙ СОВЕЦКАЙ МОЛАДЗІ!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (бальшэвікоў).

## Усе сілы на аднаўленне разбуранай гаспадаркі

Сёння мы святкуем свой слаўны юбілей 25 годдзя Ленінска—Сталінскага комсамола. Вялікая і бязмежна наша радасць! Пасля доўгіх дзён фашысцкай няволі мы зноў уліліся ў вялікую сям'ю Советскага Саюза. Чырвоная Армія вярнула нам жыццё, волю і шчасце. Мы зноў атрымалі права на працу, на вучобу, на адпачынак.

За час свайго панавання ў нашым раёне гітлераўцы ператварылі яго ў руіны, у папялішча. Спалены школы, бальніцы, клубы, спалены дзесяткі вёсак і сёл. Тысячы нашых родных, бацькоў, сясцёр, братоў угнана на гітлераўскую катаргу, замучаны ў турмах, расстраляны. Мы гэтага ніколі не забудзем і не даруем!

Мы клянёмся, што зробім усё, каб найхутчэй аднавіць разбураную гаспадарку, залячыць яе раны. Мы ўключаемся ў прадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва і абавязуемся арганізаваць комсамольска-маладзёжныя брыгады і зараз жа прыступіць да работы па аднаўленню і будаўніцтву школ, жылых дамоў, бальніц, клубаў, па збору трафейнай зброі і метал—лому. К дню 26 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі мы абавязуемся дапамагчы аддзелу народнай асветы аднавіць школу, сабраць для яе падручнікі, пісьмовыя прылады, наладзіць улік дзяцей школьнага ўзросту. Сабраць сярод насельніцтва літаратуру для адкрыцця гарадской бібліятэкі.

Мы заклікаем комсамольскую моладзь усяго раёна ўключыцца ў актыўную творчую работу па аднаўленню разбуранай гаспадаркі, упартай, настойлівай працай дапамагчы Чырвонай Арміі канчаткова разграміць фашысцкіх катаў

(Прынята аднагалосна на комсамольска—маладзёжным сходзе г. Лёзна)

жр 3228



# КОМСАМОЛЬЦЫ ЛЕЗНЕНШЧЫНЫ Ў БАРАЦЬБЕ З НЯМЕЦКІМІ АКУПАНТАМІ

Т. Дубокўа, сакратар Лёзненскага РК ЛКСМБ

Гітлераўскія бандыты, з першых дзён акупацыі нашага раёна, усімі сіламі, усімі сродкамі імкнуліся вытравіць з моладзі савецкі „дух“, пераўтварыць яе ў паслухмяных рабоў нямецкіх паноў і капіталістаў. Не праходзіла дня, каб фашысцкія душагубы не праследавалі-б тым ці іншым населеным пункце паляванне за юнакамі і дзяўчатамі. І той хто пападаўся ў бандыцкія лапы, адпраўляўся на гітлераўскую катаргу, ў канцлагеры, на верную смерць. Але ні жорсткія катаванні, ні шыбеніцы, ні турмы — не маглі зламіць волі да барацьбы нашага народа, нашай моладзі.

З першых дзён акупацыі раёна комсамольцы і несаюзная моладзь пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый уключыліся ў актыўную барацьбу з нямецкімі акупантамі.

Спачатку комсамольцы распаўсюджвалі савецкія лістоўкі, вялі агітацыйна-масавую работу, ўсялякі зрывалі мерапрыемствы гітлераўскіх улад.

Хутка комсамольцы нашай арганізацыі ўліліся ў партызанскія атрады пад камандаваннем Алексея. За час баявой дзейнасці партызаны брыгады тав. Алексея знішчылі больш 6000 гітлераўцаў, значная доля знішчэння ліку прыпадае на рахунак комсамольцаў і моладзі.

Па ўсяму раёну гучала слава партызанскага атрада, якім кіраваў комсамолец Наўмаў Міша. Больш 500 гітлераўцаў знішчылі народныя мсціўцы гэтага атрада, спусцілі пад адкос 7 воінскіх эшалонаў, знішчылі многа масцоў, складаў.

Міша асабіста знішчыў некалькі дзесяткаў гітлераўцаў. У адным з баёў з ворагам ён загінуў геройскай смерцю. Памяць аб ім будзе вечна жыць у народзе.

Добра вядомы партызанам і насельніцтву імёны маладых патрыётаў-комсамольцаў Гырыгіна Андрэя, Волкава Івана, адважнага кулямётчыка Невзорава, бранябойшчыка Нячорава, Багданава Слаўкі, Сметаніна Сяргея, разведчыцы Шапуровай Соні, Гарланава Валодзі. За мужнасць і адвагу, праяўленыя у барацьбе з нямецкімі акупантамі, ўсе яны ўзнагароджаны савецкім урадам ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза.

Не жалеючы сіл і жыцця самаадданна змагаліся комсамольцы з нямецкімі акупантамі.

Аднойчы, ў час бою з карнікамі, група партызан у колькасці 7 чалавек папала ў акружэнне. З усіх бакоў на смельчакоў насядалі азвярэлыя бандыты. Савецкія патрыёты не разгубіліся. З крыкамі „Ура“ „За Радзіму, „За Сталіна“ кінуліся яны на фашыстаў, косячы іх з аўтаматаў і вінтовак. Некалькі дзесяткаў трупаў ляглі на іх шляху. Варожае кальцо было прарвана.

У час бою былі цяжка ранены комсамольцы Гарланаў Валодзя і Максіменка Валодзя. Гітлераўцы кінуліся да іх, каб захапіць жывым. Да апошняга патрона білі героі ворага. А калі немцы наблізіліся да іх на некалькі крокаў, раздаўся выбух. Гэта Валодзя Гарланаў кінуў апошнюю гранату, на якой падарваўся сам і яго таварыш. Героі палічылі лепш памерці, чым папасць ў лапы фашыстаў...

Комсамолка Аня Салаўёва пайшла ў разведку і трапіла ў рукі гітлераўцаў. Яны доўга яе катавалі, мучылі, марылі голадам, пытаючы, дзе знаходзіцца атрад. Але Аня нічога ім не сказала.

Яе прывялі да шыбеніцы перад пятлёю. Нямецкі афіцэр запытаўся: „Ну, а цяпер што ты скажаш у апошнім слове?“ Аня, стоячы з пятлёю на шыі перад натоўпам, смела прамовіла: „Можаце мяне павесіць, але я вам, гадзь, нічога не скажу“.

Такіх прыкладаў самаадданай барацьбы можна было прывесці бясконцую колькасць. Усе яны паказваюць бязмерную любоў і адданасць савецкай моладзі да сваёй Радзімы, партыі Леніна-Сталіна, і непрымірымую ненавісць да ворага.

## У ЧЭСЦЬ 25-ГОДДЗЯ ВЛКСМ.

### ПЕРАВЫКАНАЛІ НОРМУ.

Па-ударнаму працуюць комсамольска-маладзёжныя брыгады на будаўніцтве чыгункі. Моладзь гарыць жаданнем хутчэй аднавіць разбураную гітлераўцамі чыгунку, каб хутчэй загудзелі на ёй цягнікі, павязлі на фронт гарматы, танкі, боепрыпасы.

У азнаменаванне 25-годдзя ВЛКСМ комсамольска-маладзёжная брыгада калгасніка Башаева Пётры перавыканала ўстаноўленую норму на 160 процантаў.

ГАЛІКАЎ І.

### ПАДАРУНКІ ВОІНАМ—ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ.

Па ініцыятыве комсамольцаў Лёзна моладзь Лёзненшчыны праводзіць збор падарункаў воінам-вызваліцелям. Ужо сабрана больш 100 падарункаў, сярод іх: насавыя хустачкі, кісеты, ушанкі, пальчаткі, наскі.

Больш кісетаў і хустачак з шаўковага або бархатнага матэрыялу з любоўна вышытымі на іх словамі: „Дарагому Лёзенцу-вызваліцелю ад Ноны“. „Храбраму кулямётчыку—вызваліцелю ад Валі“. „Вялікае дзякуй дарагому байцу—вызваліцелю,, і г. д.

У падарунках маюцца пісьмы, або проста запіскі з простымі, задушэўнымі словамі. Маладая калгасніца з калгаса „Адказ ворагам“ Чарніцкага сельсовета Струкава Ніна прынесла скромны падарунак—насавую хустачку у якой было закручана пісьмо. Ніна піша: „Дарагі, невядомы баец—вызваліцель! Каб вы толькі ведалі, як нам цяжка і горка жылося ў нямецкай няволі, як мы чакалі вашага прыхода. Ад імені ўсіх калгаснікаў шчырае Вам дзякуй за вызваленне ад немцаў—людаедаў. Біце іх, паганцаў, усіх да аднаго і са скорай перамогай вяртайцеся да нас у госці“.

### АБ'ЯВА.

2 лістапада ў памяшканні Райвыканкома (Садовая 33) адбудзецца сход інтэлігенцыі раёна. Пачатак ў 12 гадзін дня.

Адказны рэдактар С. І. ЫДАЎ

Адрас рэдакцыі: Лёзна, Садовая вуліца 32